# КАЛТУНОВА
# Галіна Паўлаўна



Нарадзілася Галіна Паўлаўна ў вёсцы Падгайна ў сям'і настаўніка. Праз два гады пасля яе нараджэння бацька памёр, і маці адна гадавала дзвюх дачок у галодныя і халодныя пасляваенныя гады. Многа працавала сама і іх прывучыла да працы, акуратнасці і беражлівасці. Немалым падспор'ем у зімовы час былі высушаныя грыбы, ягады, яблыкі, шыпшына, сабраныя ў лесе дзяўчынкамі. І на ўсё жыццё засталіся ў памяці Галіны Паўлаўны непаўторна смачныя, духмяныя маміны ламанцы ды булкі з макам. Навучыўшыся чытаць, Галіна ўвесь свой вольны час праводзіла за кнігай, чытала нават пры святле поўні. А летам яе штодзень клікаў лес, дзе такая прыгажосць!

У 1964 годзе Галіна Паўлаўна з сярэбраным медалём скончыла Цырынскую СШ і паступіла на філалагічны факультэт БДУ імя У. І. Леніна ў Мінску. На працягу 5 гадоў навучання была актыўнай удзельніцай літаратурнага аб'яднання “Узлёт”. Яе вершы друкаваліся на старонках рэспубліканскіх газет, у нашай раёнцы.

Прыехаўшы па месцы працы мужа ў Карэліцкі раён, працавала выкладчыцай рускай мовы і літаратуры ў Варанчанскай СШ, а з 1974 па 2005 гады — намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце ў Карэліцкай СШ, на базе якой пазней былі праведзены яе аўтарскія абласныя курсы па выхаваўчай рабоце. Педагог-майстар, выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, кіраўнік літаратурнага аб'яднання “Рэчанька” пры раённай газеце “Полымя”, вядучая калісьці традыцыйных у Карэлічах злётаў салдацкіх удоў, сустрэч з жанчынамі-маці раёна, вечароў-ушанаванняў сем'яў розных пакаленняў, лаўрэат прэміі Гродзенскага абласнога савета жанчын. У сакавіку 2006 года імя Г. П. Калтуновай было занесена ў раённую Кнігу Славы. Шматлікія граматы, падзякі, як і ўдзячныя пісьмы і паштоўкі, беражліва захоўваюцца ў дамашнім архіве Галіны Паўлаўны. А іх так многа, і ў кожнай — словы павагі, падзякі ад людзей, удзячнасці сваёй любімай настаўніцы.

Такіх пісем і паштовак шмат. І гэта яскравы прыклад ацэнкі працы Настаўніка, яго ўменння дакрануцца душой да кожнага вучня, раскрыць і развіць яго творчы патэнцыял і працоўныя навыкі, выхаваць дастойнага грамадзяніна краіны.

Працавітая, няўрымслівая і ўважлівая Галіна Паўлаўна кожны дзень была жывым прыкладам удумлівых, творчых адносін да працы. Яна поўнасцю аддавала сябе любімай справе, шліфавала майстэрства, упэўнена дабівалася задуманага, жыла ў пастаянным пошуку новага і перадавога.

Пад яе кіраўніцтвам педагагічны калектыў працаваў творча, са шчодрай аддачай. Школа неаднаразова выходзіла пераможцам у конкурсах за лепшую пастаноўку выхаваўчай работы.

Такія адценні яе характару як дабрыня, патрабавальнасць, настойлівасць і душэўнае багацце праяўляліся і ў сям'і, у выхаванні дачок Таццяны і Дзіяны, у адносінах з блізкімі сябрамі, суседзямі, у літаратурнай творчасці. Наогул, ва ўсёй яе творчасці праяўляюцца рэдкія душэўныя якасці, яна лечыць сэрцы шчырасцю, спагадай. Яе творы, быццам ручаінкі святла, высакароднасці і любові да людзей, роднай зямлі. Быццам сонечныя промні абаграваюць людскія душы, напаўняюць іх струменнямі прыгажосці.










У 1999 годзе выходзіць зборнік вершаў Г. П. Калтуновай “Споведзь душы маёй”, у 2011 — “Душы маёй зачараванне, Мой край Карэліцкі”.

І асаблівы скарб яе творчасці — кніга “Карэліцкія Мадонны”. Гэта летапіс жыцця жанчын раёна за пасляваенныя гады, настольная кніга для маладога пакалення, а для старэйшага — яшчэ адна незабыўная сустрэча са складанымі лёсамі, мужнымі і прыгожымі карэліцкімі жанчынамі. З нецярпеннем чытачы чакаюць яе нарысы пра людзей Карэліччыны, бо яна знаходзіць такія штрыхі і факты з жыцця, якія выпраменьваюць хараство кожнага чалавека.

## Душы маёй зачараванне

Душы маёй зачараванне,
Мой край Карэліцкі, адзіны,
Жыве тут рэдкі дух яднання,
Любві, адданасці Айчыне.
Тут краявіды, нібы казка,
Званы тут песню шчасця б'юць,
А ў кожным доме шчырасць, ласку
Вам разам з хлебам паднясуць.
Тут дабрынёю лечаць сэрцы,
Тут зла не пусцяць на парог,
Усім тут хораша жывецца.
Хай будзе так! Шануй Вас Бог!

## Найлепшы ў свеце Карэліцкі край

Найлепшы ў свеце Карэліцкі край!
Вабіць сэрца птушынымі песнямі гай.
Сінь Ушанскай вады, ціхай Сэрвачы плынь,
Карагоды рабін, сонцам тканых вяргінь,
Дзе ад коласа важкага поле звініць,
А світанкі такія, што нельга забыць!
Дзе ў кожным двары шчасця хопіць на век,
Дзе працоўнаю славай жыве чалавек!
Квітней, радзімая старонка,
Мацуй, Карэліччына, лёс,
Каб твой народ, як песню, звонка
Свой гонар на вякі пранёс!

* * *

Цяпло тваёй рукі - вада жывая
Параненаму сэрцу і душы.
Насуперак пачуццям - заклінаю:
Цябе забыцца мне дапамажы,
Бо лёс не перайначыш і не зменіш,
Дарослыя ўжо дзеці, сталы ўзрост.
І да спаткання нам - ты, можа,
не паверыш,-
Дарога роздумаў у сотні доўгіх вёрст.
Не, не хачу каб плётак чарнатою
Аднойчы знішчылі кахання прыгажосць,
А буду жыць я радасцю зямною,
Што ты ў мяне на свеце ёсць.

* * *

Каханнем трэба даражыць,
Як даражым здароўем, шчасцем,
Як даражым жаданнем жыць.
Шануйце не само паняцце,

А дзіўнай радасці ўзлёт
Спатканняў і прызнанняў першых,
Пры спрэчках растапіце лёд
Цяплом пяшчотнай нізкі вершаў.

Замест папрокау лепш успанянуць
Свой пацалунак першы, сарамлівы...
Каханнем трэба даражыць,
Калі ты хочаш быць шчаслівым.